Работніца і Калгасьніца Беларусі

№ 15 (160)

XVIII
9892
XII
Б А 12242

Аб становішчы трусагадоўлі і трусаразмнажэньня і аб далейшых мерапрыемствах

Пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ

Адзначаючы зусім нездавальняючае становішча трусагадоўлі, як па галіне гаспадарчых і грамадзкіх арганізацый і зусім слабую ўвагу в боку прафарганізацый, так і ў галіне аднаасобнікаў—аматараў, наяўнасьць усяго 55 проц. вытворнікаў супроць пляну і ўлічваючы, што трусагадоўля і трусазабесьпячэньне ў значнай ступені можа папоўніць мясныя і тлушчавыя рэсурсы для дыэтхарчаваньня,—прэзыдыум ЦСПСБ пастанаўляе:

1. Прапанаваць Белкаапсаюзу, Белжылсаюзу ў тэрміновым парадку не пазьней як 15 мая распрацаваць плян арганізацыі трусагаспадарак па сваёй сыстэме, а таксама прапанаваць Белкапхарчу складьці плян і прыступіць да арганізацыі трусагадавальнікаў пры сталоўках, прыгарадных гаспадарках, Жактах, ставячы мэтаю мець пры кожнай сталоўцы трусагадальнік ня менш як на 80 матак.

2. Прапанаваць усім РПС на працягу бліжэйшай дэкады арганізаваць і правесьці нарады па пытаньні становішча трусагадоўлі ў раёне, мабілізуючы ўвагу вакол гэтага пытаньня сярод рабочых.

3. Прапанаваць усім ЦП саюзаў, сэктару масавых кампаній і сэктару культработы правесьці работу па папулярызацыі трусагадоўлі сярод рабочых, служачых, як калектыўных, так і аднаасобнікаў—аматараў.

4. Прасіць Радыёцэнтр правесьці па радыё рад гутарак-лекцый аб трусагадоўлі як агітацыйна-папулярызацыйнага зьместу, так і практычнага.

5. Зьвярнуць увагу НК Аховы Здароўя, ЦП саюзу Мэдсанпрацы, НКАсьветы і ЦП саюзу Працасьветы на неабходнасьць разьвіцьця трусагадоўлі пры бальніцах, сельскіх школах, дзіцячых дамох, а таксама ўвядзеньне ў школах спэцыяльных гутарак на тэмы практычнага навучаньня вучняў трусагадоўлі.

6. Даручыць сэктару прамкадраў дамовіцца з адпаведнымі арганізацыямі аб правядзеньні раду курсаў—канфэрэнцый у рабочых цэнтрах і арганізацыі трох месячных курсаў па трусагадоўлі.

7. Лічыцьнеабходным арганізаваць пры Белкапсаюзе камітэт садзейнасьці разьвядзеньню трусагадоўлі з прадстаўнікоў: ЦСПСБ, рэдакцыі газэты „Зьвязда", „Рабочий", БКС, Белптушкапрадукту, Наркамзему, Белпаляўнічсаюзу і Менскага ГПС.

8. Даручыць прэзыдыуму БКС у дэкадны тэрмін распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па фінансаваньні яго сыстэмы па разгортваньні трусагадоўлі.

9. Прасіць рэдакцыю газ. „Рабочий" асьвятляць на старонках друку ход становішча трусагадоўлі і трусаразмнажэньня.

10. Для большага азнаямленьня працоўнага насельніцтва з пытаньнем арганізацыі трусагадоўлі, прапанаваць Віцебскаму, Менскаму, Гомельскаму, Барысаўскаму, Бабруйскаму, Полацкаму ГРПК арганізаваць выстаўкі па трусагадоўлі.

11. Даручыць ЦП саюзу друкароў разам з Белдзяржвыдавецтвам выпусьціць рад плякатаў па папулярызацыі гэтага мерапрыемства.

12. Праз месяц заслухаць даклад Белтруссаюзу Менскага ГПС аб ходзе разгортваньня трусагадоўлі.

Разгортваньне трусагадоўлі пакуль яшчэ ў праекце і на паперы

Нарада прадстаўнікоў НКА, НКЗ, Калгасцэнтру, праведзеная 17-V жансэктарам ЦК, паказала, што пастанова ЦК УсеКП(б) аб разгортваньні трусагадоўлі не рэалізавана. Наркамаховы здароўя толькі насьпеў разаслаць паперы, а што робіцца на мясцох—ня ведае, нават ня ведае, што робіцца ў Менску. Ня лепш справа стаіць і ў Наркамасьветы. Прадстаўнік Наркамасьветы мог сказаць толькі аб дашкольных установах і сказанае зводзілася да таго, што ні адзін дзіцячы сад яшчэ гэтай працы не распачаў, а магчымасьці для гэтага ёсьць. Толькі гарадзкая менская інспэктура асьветы жыва адгукнулася на пастанову ЦК і правяла масава-растлумачальную працу сярод загадчыкаў школ і ў саміх школах. Справа трусагадоўлі сярод дашкольных працаўнікоў не папулярызавана. Жакты таксама яшчэ топчуцца на месцы і далей паперак не пашлі.

Пара ад паперак перайсьці да практычнай працы. Разгарнуць масавую працу для папулярызацыі пастановы ЦК УсеКП(б) праз нарады і сходы і прыступіць да практычнай справы арганізацыі трусагадоўлі пры сталоўках, бальніцах, школах, дзіцячых дамох, дзіцячых садох і інш. Трэба памятаць, што трусагадоўля не забава, а новая крыніца рабочага забесьпячэньня.

Радзіна.



Трусагадоўчыя гаспадаркі арганізаваць пры заводах і фабрыках праз ЗРК і заводзкія сталовыя; пры сталовых Нархарчу, якія існуюць па-за прадпрыемствамі; пры школах, дзіцячых дамох, бальніцах і дамох адпачынку.

У справе арганізацыі трусагадоўчых гаспадарак не дапускаць бюракратычнай цэнтралізацыі, а разьвіваць іх на аснове самадзейнасьці заводзкіх арганізацый і максымальнага выкарыстаньня ўсіх мясцовых рэсурсаў".

(З пастановы ЦК УсеКП(б) ад 8-га мая 1932 г.)

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

XVIII
9892

РАБОТНІЦА І КАЛГАСЬНІЦА
БЕЛАРУСІ

МАЙ
1932 год

8-мы год выданьня

№ 14 (160)

Забараніць спагнаньне мясцовага разавага збору з гандлю з рук птушкай, яйкамі, малаком, маслам, сырам, які праводзіцца калгасьнікамі і аднаасобнымі працоўнымі сялянамі.

Устанавіць, што даходы калгасаў і калгасьнікаў ад продажу на рынку прадуктаў сваёй с-г. вытворчасьці не абкладаюцца сельска-гаспадарчым падаткам.

Гандаль калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобных працоўных сялян праводзіць па цэнах, якія складваюцца на рынку, а гандаль калгасных аб'яднаньняў па цэнах, ня вышэй сярэдня камэрцыйшых цэн у дзяржаўным гандлі.

(З пастановы ЦВК і СНК СССР)

Пастановы партыі і ўраду—у масы

У пачатку мая бягучага году апублікаваны пастановы ЦК УсеКП(б) і Саўнаркому СССР аб пляне збожжазагатовак ураджаю 1932 г., аб жывёлазагатоўках і разгортваньні калгаснага гандлю збожжам і мясам, а таксама дэкрэт ураду аб сельска-гаспадарчым падатку на бягучы год.

Гэтыя пастановы партыі і ўраду арганічна вынікаюць з генэральнай лініі партыі, прадстаўляюць сабою суму мерапрыемстваў накіраваных на далейшае ажыцьцяўленьне пасьлядоўнай ленінскай палітыкі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Гэтыя дакуманты ўсім сваім зьместам накіраваны на далейшае арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, на пашырэньне калгаснай вытворчасьці, на яшчэ большае разьвіцьцё гаспадарча-вытворчай ініцыятывы і самадзейнасьці калгасных мас, на стварэньне шырокай і моцнай харчовай базы першай пяцігодкі і на гэтай аснове, на яшчэ большае павышэньне матар'яльна-эканамічнага ўзроўню рабочай клясы і шырокіх працоўных мас.

Задача партыйных арганізацый заключаецца ў тым, каб пастановы ЦК і СНК давесьці да кожнай работніцы сельскай гаспадаркі, да кожнай калгасьніцы, растлумачыць ім сутнасьць тых вялізарных зрухаў, якія адбыліся ў першай пяцігодцы ў сацыялістычнай эканоміцы Савецкага саюзу. Бальшавіцкая партыя, пад непасрэдным кіраўніцтвам свайго ленінскага ЦК і правадыра сусьветнага пралетарыяту тав. Сталіна, на аснове няўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі, забясьпечыла завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР у трэцім годзе першай пяцігодкі і гэтым самым стварыла ўсе магчымасьці для пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва ў другім пяцігодзьдзі.

Гэтыя гіганцкія посьпехі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва вымагаюць далейшага разьвіцьця сельска-гаспадарчай вытворчасьці, патрабуюць яшчэ шпарчэйшых тэмпаў таваразвароту, далейшага паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў рабочай клясы.

Пастановы ЦК і СНК, закон аб сельска-гаспадарчым падатку, пры іх няўхільнай рэалізацыі ва ўмовах кожнага раёну, яшчэ больш умацоўваюць і пашыраюць вытворчы фундамант калгасаў як асноўнай гаспадарчых адзінак, умацоўваюць калгасы на іх арцельнай стадый разьвіцьця. Як адно з рашаючых зьвеньняў у справе далейшага разьвіцьця сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі і шырокага разгортваньня ініцыятывы і самадзейнасьці калгасных мас, партыя і ўрад высоўваюць задачу разгортваньня савецкага гандлю. Дырэктывы партыі і ўраду аб загатоўках збожжа і жывёлы падводзяць магутную базу пад калгасны гандаль. У пастановах ЦК і СНК гаворыцца:

— „Прызнаць мэтазгодным па сканчэньні выкананьня гэтага збожжазагатоўчага пляну і стварэньня насенных фондаў, г. зн. з 15 студзеня 1933 году, даць калгасам і калгасьнікам поўную магчымасьць бесьперашкоднага продажу лішкаў свайго збожжа, на свой погляд, як на базарах і рынках, так і ў сваіх калгасных крамах, абавязаўшы мясцовыя органы ўлады аказваць у гэтым калгасам і калгасьнікам поўную садзейнасьць і прыняць меры да выкараненьня прыватнікаў і перакупшчыкаў спэкулянтаў, якія прабуюць нажыцца на калгасным гандлі".

У пастанове аб жывёлазагатоўках і разгортваньні калгаснага гандлю мясам, зьніжаючы плян жывёлазагатовак удвая калгасам, калгасьнікам і бедняком і серадняком-аднаасобнікам, якія акуратна выконваюць плян цэнтралізаваных загатовак, даецца поўнае права бесьперашкоднага продажу жывёлы, птушкі і рознай мясной прадукцыі сваіх гаспадарак на рынках, базарах і праз калгасныя ларкі. Пастановы ЦК і СНК катэгарычна забараняюць „мясцовым органам улады ўводзіць які-б там ні было абмежаваньні па продажу калгасамі, калгасьнікамі і аднаасобнікамі мясной прадукцыі іх гаспадарак, выкараняючы прыватнікаў і перакупшчыкаў спэкулянтаў, якія прабуюць нажыцца на мясным гандлі працоўных сялян".

Новы дэкрэт аб сельска-гаспадарчым падатку прадугледжвае спэцыяльныя ільготы калгасам, калгасьнікам і аднаасобнікам. Гэтыя ільготы стымулююць разьвіцьцё савецкага і калгаснага гандлю. Прыбыткі калгасаў ад гандлю праз калгасныя рынкі і ларкі вызваляюцца ад абкладаньня падаткам.

Гэта стварае шырокія магчымасьці больш шпаркага разгортваньня таваразвароту, далейшага павышэньня таварнасьці гаспадаркі і ўраджайнасьці калгасных палёў, магчымасьці для

ДЕРЖАВНА ПУБЛІЧНА БІБЛІОТЕКА 21 32 ОДЕСА

паскарэньня разгортваньня жывёлагадоўлі. Кожны калгасьнік бядняк і серадняк-аднаасобнік павінен зараз-жа паставіць пытаньне аб пашырэньні пасеўнай плошчы, аб разьвіцьці кармовай базы з тым, каб атрымаць столькі прадукцыі, пры наяўнасьці якой можна, пасьля выкананьня абавязкаў перад дзяржавай, шырока разгарнуць гандаль. Кожны калгасьнік і аднаасобнік павінен усьвядоміць, што дае яму гандаль хлебам і мясам, якія ён мае ад гэтага ільготы і магчымасьці для гаспадарчага ўмацаваньня калгасу. Паскарэньне ходу сяўбы, перавыкананьне пасеўных плянаў, павялічэньне пагалоўя жывёлы, свячасовая ўборка сена, выкананьне плянаў сіласаваньня—вось тыя шляхі, якія дадуць магчымасьць калгасьнікам шырока разгарнуць гандаль сельска-гаспадарчымі прадуктамі.

Пастановы ЦК і Саўнаркому ставяць перад партыйнымі арганізацыямі надзвычай адказныя задачы. Гэтыя задачы зводзяцца да таго, каб дакуманты партыі і ўраду, накіраваныя на далейшае разьвіцьцё калгаснай вытворчасьці, давесьці да самых шырокіх мас работніц саўгасаў, МТС і калгасьніц. Партыйныя ячэйкі павінны забясьпечыць, каб кожны дэлегацкі сход глыбока прапрацаваў пастановы ЦК і Саўнаркому, каб кожная работніцтва, кожная калгасьніца выразна сабе ўяўляла глыбокую палітычна-гаспадарчую сутнасьць пастаноў партыі і ўраду.

Дэлегацкія сходы адыгрываюць надзвычай вялікую ролю ў дапамозе партыйным арганізацыям па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Кожная дэлегатка павінна ня толькі сама выразна разумець сутнасьць пастаноў партыі і ўраду, але павінна ў простай і папулярнай форме растлумачыць масам жанчын калгасьніц і аднаасобніц. Там, дзе жанчыны калгасьніцы і аднаасобніцы не ахоплены распрацоўкай і вывучэньнем пастаноў праз агульна-калгасныя сходы, трэба правесьці спэцыяльныя нарады жанчын-калгасьніц і аднаасобніц, на якіх паставіць пытаньні аб гэтых трох важнейшых дакументах і аб ролі жанчын у іх практычным ажыцьцяўленьні. Апрача гэтага, трэба шырока скарыстаць перапынкі ў полі, брыгадныя нарады калгасьніц з тым, каб узброіць шырокія масы працоўных жанчын зьместам партыйных дырэктыў, якія вызначаюць далейшыя практычныя шляхі ажыцьцяўленьня лініі бальшавіцкай партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Вучобу на дэлегацкіх пунктах, палітычна-масавую работу сярод працоўных жанчын трэба пранізаць зьместам гэтых дакументаў.

Калгасьніцы і працоўныя аднаасобніцы павінны даваць жорсткі адпор спробам адарваць распрацоўку гэтых важнейшых пастаноў ад практычнай работы па калгасным будаўніцтве, па разгортваньні сяўбы. Вывучэньне гэтых трох дакументаў—зьяўляецца магутным вагаром у барацьбе за пасьпяховую бальшавіцкую сяўбу. Распрацоўка пастаноў у масах калгасьніц і аднаасобніц—бяднячак і серадняцтва—магутны вагар у справе ўздыму новай хвалі сацспаборніцтва і ўдарніцтва на калгасных палёх, магутны вагар уздыму на яшчэ большую вышыню вытворчай ініцыятывы калгасьніц, работніц саўгасаў і калгасаў у перавыкананьні пасеўных плянаў.

Распрацоўка пастаноў ЦК і СНК павінна суправаджацца высоўваньнем дадатковых сустрэчных плянаў, датэрміновым выкананьнем узятых на сябе абавязацельстваў.

Шэфскія арганізацыі гарадзкіх прадпрыемстваў гарадзкія дэлегацкія сходы павінны аказаць дапамогу ў сэнсе распрацоўкі дырэктыў ЦК і СНК дэлегаткам-калгасьніцам і аднаасобніцам.

Рэшткі разгромленага кулацтва будуць усе меры ужываць да таго, каб сарваць ажыцьцяўленьне гэтых дырэктыў партыі і ўраду, будуць імкнуцца скарыстаць для сваіх варожых мэт адсталых калгасьніц і аднаасобніц. Таму патрэбна вялікая клясавая пільнасьць усіх партыйных і савецкіх арганізацый, каб быць гатовым у любы момант даць зьнішчальны адпор кулацкім вылазкам.

ЦК УсеКП(б) і СНК спэцыяльна падкрэсьліваюць у пастанове аб барацьбе з усялякімі спробамі спэкулянтаў нажыцца на калгасным гандлі. Ніводная партячэйка, ні адна савецкая і грамадзкая ўстанова не павінны забываць таго, што клясавы вораг у барацьбе супроць пераможнага сацыялістычнага наступленьня будзе ўжываць усе сродкі і мэтады, каб падарваць савецкі калгасны гандаль.

Праваапартуністычны самацёк у разьвіцьці калгаснага гандлю па сутнасьці дапамагае ворагам сацыялістычнага будаўніцтва, ворагам рабочых і калгасных мас. Стаўка на самацёк у разьціцьці калгаснага гандлю грае на руку іменна тым элемэнтам, з якімі пастановы ЦК і СНК прапануюць весьці ўзмоцненую барацьбу, ужываць усе меры „да выкараненьня прыватнікаў і перакупшчыкаў-спэкулянтаў, якія прабуюць нажыцца на калгасным гандлі". Падрываюць справу разгортваньня савецкага гандлю і „левыя" апартуністы, якія падмяняюць глыбокую арганізатарскую работу з масамі голым адміністраваньнем і балбатнёй аб непатрэбнасьці гандлю, аб пераходзе да непасрэднага „прадукта абмену". Уся гэта „лявацка"-апартуністычная балбатня ёсьць самая шкодная спроба затармазіць больш шпаркае разьвіцьцё таваразвароту ў краіне і, на яго аснове, далейшае паляпшэньне снабжэньня рабочых і працоўных мас як гораду, так і вёскі.

Прапрацоўваючы пастановы ЦК і СНК, ставячы іх вывучэньне на высокі тэарытычны ўзровень, увязваючы з практычнай работай калгаснага будаўніцтва, партыйныя арганізацыі павінны даваць самы жорсткі адпор правым і „левым" апартуністам і прымірэнцам да ўхілаў ад лініі партыі, павінны яшчэ больш згуртаваць сельска-гаспадарчых рабочых, работніц, калгасьнікаў і калгасьніц на барацьбу за выразнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за пасьпяховае выкананьне гаспадарча-палітычных задач чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

А. Градэцкі.

Калгасьніцы і працоўныя аднаасобніцы! На пастановы ЦК і СНК адкажам датэрміновым выкананьнем плянаў пасеўкампаніі, ударнай падрыхтоўкай да ўборачнай

ВЫХАВАЕМ МАЛАДОЕ ПАКАЛЕНЬНЕ „СА СТАЛЁВЫМІ НЭРВАМІ І ЖАЛЕЗНЫМІ МУСКУЛАМІ“

Другая ўсесаюзная канфэрэнцыя камсамолу, прызнаўшы „канечную неабходнасьць самаарганізацыі пралетарскіх дзяцей“, даручыла ЦК „распрацаваць пытаньне аб дзіцячым руху“ і гэтым палажыла пачатак арганізацыі дзіцячых мас пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі. Зараз з 23 мая па 1-VI піянэрская арганізацыя і ўся грамадзкасьць сьвяткуем 10-год ьдзе піянэрскай арганізацыі.

Школьнікі піянэры дапамагаюць рамонту с..гаспад. інвэнтара ў калгасе „Ленінскі шлях“.

10 год існаваньня піянэрскай арганізацыі—гэта гады барацьбы за камуністычнае выхаваньне падрастаючага пакаленьня. „Мільёны дзяцей пад кіраўніцтвам партыі і комсамолу далучыліся праз піянэрскі рух да новага грамадзкага жыцьця, пашырылі сваё грамадзка-палітычнае разьвіцьцё і ўвайшлі ў рады актыўных і сьвядомых будаўнікоў сацыялізму“ (З пастановы ЦК УсеКП(б) ад 21-IV—32 году).

Асноўны палітычны зьмест гэтай кампаніі—паказаць, што толькі ў краіне, якая свабодна будуе сацыялізм, магчыма выхаваньне „ўсебакова разьвітых будаўнікоў“, што толькі ў краіне дыктатуры пралетарыяту магчыма пасьпяховае разьвіцьцё масавых дзіцячых арганізацый, як шматмільённых піянэрскіх арганізацый, заснаваных на актыўнасьці і самадзейнасьці дзяцей і пасільным удзеле іх у будаўніцтве бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Зараз уся ўвага піянэрскай арганізацыі зьвернута на галоўны вучастак сваёй работы, на паляпшэньне якасьці палітэхнічнай вучобы, сьвядомай дысцыпліны, за аўладаньне „асновамі навукі“. Перад усёй пралетарскай грамадзкасьцю нашага саюзу зараз стаіць задача—выхаваць з дзяцей пакаленьне са „сталёвымі нэрвамі і жалезнымі мускуламі“.

У 10-годзьдзе піянэрскай арганізацыі перад работніцамі, калгасьніцамі стаіць пэўнае заданьне—выхаваць з нашага падрастаючага пакаленьня будучых змагароў за камунізм.

Работніцы, калгасьніцы павінны аддаць асаблівую ўвагу піянэрам, школьнікам у арганізацыі іх хатняй работы. Дзеці не павінны перагружацца цяжкай і непасільнай для дзяцей хатняй работай, трэба даць ім магчымасьць больш працаваць над павышэньнем свайго палітычнага і агульна-адукацыйнага ўзроўню, дапамагчы ім арганізаваць свой вольны час для здаровага адпачынку.

Нашы дзеці па цэлым радзе школ маюць добрыя дасягненьні ў сваёй рабоце, як па аўладаньні ведаў, так і па ўдзелу ў грамадзкім жыцьці саюзу. (Бабруйск — база электрычнай станцыі, Менск—25 школа). Але побач з гэтым рад піянэрскіх атрадаў работу ў школе не зрабіў галоўным вучасткам сваёй працы, у выніку чаго мы маем у цэлым радзе школ вялікі процант непасьпяховасьці і дрэнную дысцыпліну (Барысаў—2-я школа, 10 і 4 школы, г. Менск).

Уся грамадзкасьць павінна дапамагчы скласьці адпаведныя ўмовы для працы піянэрскай арганізацыі.

Кожная арганізацыя да 10-годзьдзя павінна распрацаваць мерапрыемствы па ўдзеле ў дапамозе партыі і камсамолу выхаваць здаровае, стойкае пакаленьне будаўнікоў камунізму.

В.



Піянэры Марозаў, Кісялёва і Сьмірноў чытаюць ліст напісаны замежным таварышам.

У дзень дзесяцігодзьдзя піянэрарганізацыі юныя ленінцы павінны рапартаваць партыі і камсамолу аб сваёй барацьбе за правядзеньне ў жыцьцё заветаў Ільліча

Месца працоўнай жанчыны ў краіны саветаў

Чалавека прыехаўшага з-за мяжы і ўпяршыню папаўшага ў СССР, надзвычай зьдзіўляе месца жанчыны ў эканамічным і палітычным жыцьці ў краіне саветаў.

Тут жанчыны займаюць пасады, якія ў капіталістычным сьвеце складаюць яшчэ манаполію мужчын. На найбольш складаных і адказных пасадах у СССР сустракаем жанчыну. Займаючы такія пасады, яна агрымлівае пэнсію аднолькавую з мужчынамі.

Гэта — бясспрэчны факт. Факт, які цалкам разьбівае ўсе аргуманты капіталістых аб тым, што пралетарская рэвалюцыя нібы зьяўляецца фактарам культурнага заняпаду.

Параўнаем становішча жанчыны на капіталістычным і сацыялістычным прадпрыемстве. У першым выпадку жанчына таксама моцна зьвязана з вытворчасьцю, з мэханічным працоўным працэсам. Але зусім інакш, чым у СССР. Яна там займае падлеглае становішча, зьяўляецца простым інструмантам. Дзейнасьць яе не накіроўваецца ўласным разуменьнем. Яна—бязвольны, бяздушны вагар, які працуе ці спыняецца ў залежнасьці ад таго ці іншага руху кіруючай рукі. Прадпрыемца—капіталіст аказвае ёй перавагу таму, што, згодна заходня-эўропэйскім колектыўным дагаворам, ёй належыць меншая зарплата, чым мужчыне, бо пры канфлікце паміж прадпрыемцам і рабочым яе лягчэй, чым мужчыну, можна ўціхамірыць у сілу яе эканамічна-залежнага становішча, рэглямантаванага капіталістычным законам, лягчэй зламаць яе супраціўленьне. Таму ў капіталістычных краінах дзейна стаіць пытаньне аб усё большым і большым выцісьненьні мужчын з вытворчасьці і замене яго больш таннай жаночай рабочай сілай—яго жонкай, якая робіцца тым самым кармільцам сям'і і прымушана пры значна зьменшанай зарплаце несьці той-жа цяжар, які раней нёс мужчына. А беспрацоўны мужчына выконвае хатнія абавязкі жонкі.

Якія прычыны такога скарыстаньня жаночай рабочай сілы. Адзіная і выключная прычына—ненасытная капіталістычная, прагнасьць нажывы. З аднаго боку яны зьніжаюць жыцьцёвы ўзровень шырокіх рабочых мас, зьніжаюць зарплату і тым самым усё больш завастраюць нэндзу. Так зараз стаіць справа ў капіталістычных дзяржавах. Ні міжнародная канфэрэнцыя, ні Ліга Нацый і ні міжнароднае бюро працы на чале з меншавікамі ня здольны змагацца з гэтай немаччу капіталістычнай гаспадарчай сыстэмы.



Група фізкультурнікаў фабзавучнікаў імя КІМ, якая здала норму на значок „Будзь гатоў да працы і абароны".

Ці існуе сродак для адхіленьня пэрыядычных крызісаў, адзін з якіх зараз перажывае капіталістычны сьвет і які дзень ад дню пагоршвае становішча шырокіх працоўных мас.

Я разумею, што адказ на гэта пытаньне напрашваецца сам сабою пры знаёмстве з сацыялістычнай гаспадаркай СССР.

У саюзе савецкіх рэспублік праводзяць рацыяналізацыю, працэсы гэтыя праходзяць у нячуваных у гісторыі тэмпах.

Нават Амэрыка, краіна „неабмежаваных магчымасьцяй", як лічаць капіталісты, ня можа пахваліцца такімі рэкордамі лічбамі.

Як уплывае рацыяналізацыя на вытворчасьць і спажываньне ў СССР, г. зн. на жыцьцёвы ўзровень працоўных мас і якое становішча жанчын на вытворчасьці. На першае запытаньне даўно ўжо дан адказ, і нават злосныя ворагі прымушаны прызнаць факт існаваньня сацыялістычнай плянавай гаспадаркі. Яны прымушаны прызнаць, што беспрацоўе ў СССР цалкам ліквідавана, што рабочы дзень скарочаны да 7 гадзін і што ў значнай частцы шасьцідзённы рабочы тыдзень заменен чатырохдзенкай. Тут дасканала можна бачыць бесьперапынны рост крывой жыцьцёвага ўзроўню працоўных мас, значыцца, працэс праціленглы існуючаму ў капіталістычнай

Ударніца т. Бабаева Разанскага Сельмашзавода.

Сушчык Тэкля член Букчанскага сельсавету, Тураўскага раёну.

краіне, дзе рацыяналізацыя выцягвае апошнія сілы ў рабочых, бо яна накіравана толькі на выжымку большага прыбытку для капіталістага.

Падыходзячы да пытаньня аб культурным росьце жанчын, я, к найвялікшаму свайму зьдзіўленьню, прымушан прызнаць, што, ня гледзячы на ўпэўненасьць у эканамічным росьце Савецкага Саюзу, я не дапускаў раней, што ў сацыялістычнай дзяржаве жанчына займае такое паважнае месца.

Прывяду некалькі канкрэтных прыкладаў. Ляля — мясцовасьць прыкладна з 12.000 насельніцтвам, па другі бок Уралу, 400 *км* ад азіяцкай мяжы з добра арганізаванай лясной прамысловасьцю. Гэта месца зараз яшчэ далёка ад таго, каб прэтэндаваць на ролю культурнага месца; але, калі я ўпяршыню трапіў на гэта прадпрыемства, мне тутжа кінулася ў вочы інтэнсыўная праца жанчын.

Шляхам гутарак з працоўнымі жанчынамі я папрабаваў паглыбіць маё назіраньні і дабіўся пры гэтым посьпеху.

Я часта гутару з работніцамі. Амаль кожная работніца заяўляе мне ясна і выразна: „Цяпер мы ведаем, для чаго працуем.

Калі мы многа і добрасумленна працуем, то зарабляем добра.

Мы жывем многа лепш, чым раней. Умовы паляпшаюцца з году ў год.

Мы самі зарабляем нароўні з муж'ямі і самі сабе гаспадары.

Тав. Кулешка—лепшая ударніца заводу „Дрэваапрацоўшчык"

Майстар ня мае права крычаць на нас, калі мы добра працуем, і вучыць нас, калі робім памылкі. Акрамя работы мы вучымся.

Дзякуючы пралетарскай рэвалюцыі, жанчына вызвалілася ад прыгнечаньня, ад залежнага становішча ў сям'і, а таксама эканамічна.

Гэтым тлумачыцца, што жанчына поўнасьцю аддае сябе, сваю інтэнсыўную працу на службу інтарэсам сацыялістычнай таспадаркі, і яе роля ў эканамічным і культурным уздыме рабочай клясы вялізарна.

Гэтым тлумачыцца, што вызваленая пралетарскай рэвалюцыяй жанчына стала аднэй з надзейных апор сацыялістычнай гаспадаркі.

Такое мною вынесена ўражаньне аб жанчыне ў пралетарскай дзяржаве.

Карл Ніхт *).

*) Карл Ніхт—аўтар гэтага артыкулу, прыяжджаў у СССР з нямецкай дэлегацыяй.

РАБСЕЛЬКОРКІ ПІШУЦЬ

Ініцыятыву Дрысы павінны падтрымаць іншыя раёны

На местачковым сходзе жанактыву было пастаўлена пытаньне аб дапамозе калгасам і саўгасам у веснавой сяўбе. Жанчыны актыўна абгаварылі гэта пытаньне і арганізавалі брыгаду для выезду ў калгасы.

На сходзе сабралі 180 руб. ў карысьць МОПР'у, арганізавалі новую ячэйку МОПР'у і абавязаліся сабраць ня менш 25 падпісчыц на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі" Г.

Дапамагаем барацьбітам

Прапойскі дэлегацкі сход калгасьніц і актыву сабраў у карысьць палітзьняволеных падшэфнай турмы гор. Дзьвінску 31 р. Дэлегацкі сход калгасьніц выклікае пасьледаваць іх прыкладу іншыя дэлегацкія сходы мястэчка Прапойску.

Калечкава П.

Начальнікі аддзяленьняў СПА ф-кі Кастрычнік (г. Менск).
Зьлева направа работніцы: Берштэн, Гайдбрык, Кантор, Годас і Гінзбург.

РАБОЧЫЯ І РАБОТНІЦЫ „ДОМБАЛЯ“ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ПРАМФІНПЛЯН ІІ КВАРТАЛУ

Завод „Домбаль“ (г. Барысаў) выканаў прамфінплян у першым квартале на 114 проц., стандартныя паказальнікі—на 105 проц.

Домбалеўцы па-бальшавіцку рэалізуюць 6 умоў т. Сталіна—гаспадарча-разрахунковых брыгад арганізавана 61 з ахопам 456 рабочых, ударных брыгад—93, якімі ахоплена 696 рабочых. На заводзе праводзіцца работа вакол пытаньня рацыяналізацыі—гэта дало свае вынікі, за першы квартал унесена 35 прапаноў, рэалізавана—27, эфэктыўнасьць іх—эканомія ў 2.300 руб.

У другім квартале завод поўнасьцю перайшоў на выраб экспартнай прадукцыі.

На зьлёце ўдарнікаў, дзе падводзіліся вынікі, паасобныя брыгады рапартавалі аб выкананьні прамфінпляну.

Зьмена „Камунарка“ выканала прамфінплян у першым квартале на 106,6 проц. У ёй ёсьць 13 гаспадарча-разрахунковых брыгад, усе рабочыя ахоплены ўдарніцтвам, зусім зьнішчаны прагулы.

Зьмена „Камунарка“ прымае штодзенна сустрэчныя пляны і дзякуючы перабудовы масавай працы па-новаму, перанясеньню працы ў цэх і брыгаду зьмена дасягнула вялікіх посьпехаў.

Брыгада № 11 гэтай зьмены, на чале з брыгадзірам т. Сьцяфанавай, выканала прамфінплян на 105,5 проц. Гэта жаночая брыгада заявіла: будзем змагацца ў II квартале за перавыкананьне прамфінпляну. Наша брыгада павінна і будзе ў II квартале на першым месцы.

Раней на заводзе ў „гуце“ ня ўжывалася жаночая рабочая сіла, а зараз работніцы ня толькі ў „гуце“ працуюць, але зьяўляюцца лепшымі ўдарніцамі, вылучаны на вышэйшыя кваліфікацыі, майстрамі, брыгадзірамі і інш.

На зьлёце лепшыя ўдарніцы—работніцы з вялікім вытворчым стажам падалі заяву ў рады партыі. Тав. Вайцяхоўская з вязальнага цэха, Сьцепановіч і Меляшэўская. Ўдарніцы заявілі: „Мы, работніцы, ня можам застацца па-за радамі партыі, будзем па-сапраўднаму змагацца за перавыкананьне прамфінпляну ў першых яе радох“.

Зьлёт прэміяваў 55 лепшых ударнікаў, з іх 25 жанчын. Выступаючыя на зьлёце адзначылі рад недахопаў—няма інтэрнату для рабочых, ня зьнішчан яшчэ канчаткова самацёк рабочай сілы.

Ёсьць значныя прагулы (у першым квартале 407 прагулаў), невыстарчальна яшчэ разгорнута барацьба за якасьць. Слаба ўцягнуты работніцы ў рацыяналізатарскую работу.

Завод „Домбаль“ мае торфазавод, які дастаўляе апал. На гэтым заводзе зусім адсутнічае культмасавая работа сярод тарфяніц.

Домбалеўцы з гонарам справіліся з колькаснымі паказальнікамі прамфінпляну, зараз патрэбна цэнтр увагі перанесьці на барацьбу за якасныя паказальнікі, на барацьбу з прагуламі.

Магілеўская.

Разгарнулі працу сярод работніц

Да вясны гэтага году сярод работніц Якаўлевіцкай суконнай фабрыкі, Аршанскага раёну, ніякай працы не праводзілася, жаночых сходаў за ўсю зіму амаль ня было ніводнага, дэлегаткі лічыліся толькі на паперы, бо на справе ніякай працы яны не праводзілі.

Калі праходзіла кампанія перавыбараў дэлегатак, работніцы Якаўлевіцкай суконнай фабрыкі ўзяліся за працу, разгарнуўшы яе на ўсе 100 проц. Арганізавалі ясьлі пры фабрыцы, вылучыўшы туды лепшых дэлегатак-работніц ударніц і зараз ясьлямі ахоплены ўсе дзеці пасёлку пры фабрыцы.

На агульным сходзе 24 красавіка г.г. дэлегаткі хатнія гаспадыні і работніцы фабрыкі праявілі вялікую актыўнасьць і добраахвотна прымацаваліся да арганізацый, як да каапэрацыі, сталоўкі і інш.; хатнія гаспадыні Тарасава М. і Усьцінава прымацаваліся ў дапамогу да сталоўкі. Халт, Мацкевіч і Сорына прымацаваліся да закрытага рабочага каапэратыву, Патапенка і Аносава — да дзіцячых ясьляй і пляцоўкі, Клябанава і Сімонава М. да бацькаўскага камітэту школы.

На гэтым-жа сходзе было пастаўлена пытаньне аб выпісцы часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі“, усе прысутныя згадзіліся падпісацца на гэту часопісь і тут-жа на сходзе была праведзена падпіска.

Надалей таксама ня трэба аслабляць працу сярод жанчын фабрыкі і як сапраўдныя бальшавікі змагацца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну на фабрыцы.

Расянкова і Гуляева.

На аснове рэалізацыі 6-ці гістарычных умоў т. Сталіна даб'емся выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну

ЧЫРВОНЫ КРЫЖ У БАРАЦЬБЕ ЗА АЗДАРАЎЛЕНЬНЕ ПРАЦЫ І БЫТУ РАБОЧЫХ

Задача Чырвонага Крыжу — падрыхтоўка працоўнага насельніцтва ў галіне санітарнай асьветы, падрыхтоўка кадраў мэдпрацаўнікоў, праз гурткі, курсы і інш. Укараненьне санмінімуму ў быт рабочага, аздараўленьне працы і быту (будаўніцтва

Дзеці ў дзіцячым садзе.

лазьняў, пральняў, дзіцячых садоў, мляцовак, ясьляй і інш.).

Чырвоны Крыж БССР ў сваёй практычнай працы ажыцьцяўляе гэтыя задачы. Ужо заключаны ўмовы з 8 торфараспрацоўкамі на правядзеньне мерапрыемстваў па паляпшэньні быту рабочых торфараспрацовак і арганізавана:

цырульняў	4
лазьняў	1
дэзустановак	1

па 4-х торфараспрацоўках праведзена поўная дэзынфэкцыя інтэрнатаў.

Па бюджэту на санітарна-аздараўляючыя мерапрыемствы вызначана: на 1932 год—628.300 руб., у 1931 годзе было 212.550 руб.

Задача па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў на падставе 6-ці ўмоў тав. Сталіна патрабуе максымальнага ўдзелу ў ёй усіх грамадзкіх арганізацый, дапамога Чырвонага Крыжу ў гэтай справе выявілася ў наступным: на 1-V—32 г арганізавана:

Пунктаў першай дапамогі сталых	1[illegible]
Радзільных ложкаў	18
Пунктаў першай дапамогі часовых	28
Ясьляй сталых	8
Ясьляй часовых	75
Пляцовак дзіцячых	48
Перасовачных зубных габінэтаў	4
Санітарных пастцў	330
Цырульняў	26
Аптэчак	312

Па санітарным мінімуме т-вам Чырвонага Крыжу БССР за 1931 год праведзены 3 паказальныя санітарныя вылазкі (2 у Менску на заводзе імя Варашылава і ў Полацку). У санаглядзе прымала ўдзел 20 брыгад, праведзена 7 суботнікаў, адкрыта адна лазьня.

Значная работа праведзена супроць эпідэміі і па барацьбе з сацыяльнымі хваробамі.

У 1932 годзе ЦК Чырвонага Крыжу была паслана ў Лельчыцкі раён экспэдыцыя ў складзе аднаго прафэсара і двух асыстэнтаў па барацьбе з сыфілісам, якая агледзіла 5.000 асоб. Была прышчэплена воспа 85.870 асобам, прапушчана праз лазьні 19.127 асоб, прачытана лекцый на тэмы прафіляктыкі эпідэмічных захворваньняў—94, дэзынфэкцый хат—38, прышчэпліваньне супроць брушнога тыфусу—84, працавала дэзкамера—1 і бан.-дэз. атрадаў—6.



Група дзяцей пад лучамі кварца.

Шляхам укараненьня санмінімуму аздаравім працу і быт рабочых

Раньняя сяўба—гэта высокі ўраджай. Калгасьніцы ударнай работай забясьпечым выкананьне і перавыкан

Адозва да ўсіх калгасьніц Беларусі

Зьлёт ударніц-калгасьніц Новасёлкаўскага сельсавету, Пухавіцкага раёну, горача вітае пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб збожжа-і жывёлазагатоўках і разгортваньні калгаснага гандлю і дэкрэт ураду аб сельгаспадатку, якія цалкам накіраваны на паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў жыцьця калгасьнікаў, на ўмацаваньне калгасаў, паляпшэньне снабжэньня рабочых гарадоў.

Асаблівую ролю ў ажыцьцяўленьні гэтых важнейшых пастаноў павінны адыграць жанчыны-калгасьніцы і, у першую чаргу, ударніцы. Ад іх у значнай ступені залежыць пасьпяховае разгортваньне жывёлагадоўлі, уборка ўраджаю і барацьба з кулацкай агітацыяй, якая накіравана на зрыў калгаснага будаўніцтва.

Бяручы на сябе рад абавязкаў па разгортваньні работы вакол важнейшых пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, мы заклікаем усіх калгасьніц, усіх ударніц калгасаў стаць у першыя рады змагароў за пасьпяховае правядзеньне сяўбы і ўборкі, узьняцьце жывёлагадоўлі і разгортваньне калгаснага гандлю.

Ударніца Сокава даглядае цялёнка. Калгас „Новае жыцьцё"

МЫ АБАВЯЗВАЕМСЯ:

Павесьці шырокую растлумачальную работу ў нашых калгасах з тым, каб у бліжэйшыя дні кожны калгасьнік і калгасьніца добра ўяўлялі сабе сутнасьць апошніх пастаноў партыі і ўраду.

Поўнасьцю засеяць пасеўную плошчу. Дабіцца поўнага скарыстаньня нашымі калгасамі вызначаныя плянам угнаеньні, арганізаваць у кожным калгасе гурток па вывучэньні агратэхнікі.

У бліжэйшыя дні паставіць перад праяўленьнямі калгасаў пытаньне аб практычным разгортваньні калгаснага гандлю. Сваячасова выконваць пляны жывёлагадоўлі.

Разгарнуць работу па датэрміновым сканчэньні збожжазагатовак да 15 сьнежня 1932 году ссыпкі насенфондаў да 1 студзеня 1933 году.

Гэтыя мерапрыемствы будзем ажыцьцяўляць шляхам сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Мы павінны дабіцца і даб'емся, каб кожная калгасьніца стала сапраўднай ударніцай калгаснага будаўніцтва.

Сартоўка бульбы для пасадкі.

Па даручэньні зьлёту: Стрэльская М. калгас „Чырвоны Бор", Кавальчук В. колгас „Новае Лядцо", Казак Л.,Беліцкая Г., Лабада Г.

Ня ўлічылі памылак мінулага году

У Бяседавіцкім сельсавеце (Касьцюковіцкі р.) не працуюць ні адны ясьлі. Калгасы ня ўлічылі памылак мінулага году, калі з-за адсутнасьці ясьляй палова жанчын ня выходзіла на працу (калгасы „13-ты Кастрычнік", імя Сталіна, „Чырвоны бор" і інш.). Зараз такое-ж самае становішча. Патрэбна зараз-жа выправіць гэту памылку.

Ф. Л.

...гасьніцы, саўгасьніцы, працоўныя аднаасобніцы— ...еравыкананьне плянаў сяўбы ў вызначаныя тэрміны

Абутнікі ў барацьбе за бальшавіцкія тэмпы сяўбы

На першым этапе разгортваньня абвешчанага „Правдой“ конкурсу нізавых газэт на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў рабкоры менскай абутковай фабрыкі, пад кіраўніцтвам партарганізацыі, разгарнулі вялікую апэрацыйна-масавую работу ў падшэфных сельсаветах Падгайскім і Сеньніцкім.

Першы выезд рабкораўскіх брыгад палажыў пачатак сыстэматычнай работы па шэфстве ўсіх грамадзкіх арганізацый фабрыкі і зараз калгасьнікі падшэфных сельсаветаў вьяўляюцца частымі гасьцямі на фабрыцы.

Арганізаваныя насьценгазэты ў калгасах пры дапамозе брыгадзіраў фабрыкі па-бальшавіцку пачалі змагацца за ўмацаваньне калгасаў, былі выкрыты кулацкія элемэнты (калгас „Першы май“), дрэнныя адносіны да сельска-гаспадарчага інвэнтару (у Падгайскім сельсавеце пасьля асеньняй уборачнай кампаніі).

Газэты павялі барацьбу з лодырамі і гультаямі. У выніку мы мелі па некаторых калгасах перавыкананьне пляну загатовак. Апрача рабкораўскіх брыгад выяжджаў цэлы рад брыгад грамадзкіх арганізацый фабрыкі, камсамольскія з мэтай арганізацыі фізкультурных гурткоў, брыгады культпалітасьветы, якія правялі масавыя вечары па пытаньні падрыхтаванасьці да сяўбы ў абодвух сельсаветах, праведзены сходы калгасьніц. Зараз кожны цэх фабрыкі замацован за асобным калгасам. Разгорнута сацспаборніцтва паміж цэхамі на лепшую працу па шэфстве над калгасам.

13 мая на фабрыцы была склікана канфэрэнцыя па пытаньні падрыхтоўкі да сяўбы, дзе прысутнічалі старшыні ўсіх калгасаў, на канфэрэнцыі быў заключан сацдагавор аб выкананьні прамфінпляну і выкананьні пляну сяўбы і ўборкі. Фабрыка вызначыла пераходны сьцяг лепшаму калгасу за пасьпяховае правядзеньне сяўбы.

Зараз сярод калгасаў разгортваецца сацспаборніцтва за пераходны сьцяг, а сярод цэхаў за лепшую дапамогу па заваяваньні гэтага сьцягу.

Фабрыка вылучыла двух сац. намесьнікаў старшынь сельсаветаў.

У барацьбе за пляны 3-яй бальшавіцкай вясны брыгады нашай фабрыкі разгортваюць баявую работу, перадаюць калгасам увесь свой багаты вопыт барацьбы за прамфінплян на аснове рэалізацыі 6 гістарычных умоў тав. Сталіна.

З пачатку сяўбы выехала 15 брыгад у розныя калгасы, якія дапамаглі калгасьнікам у расстаноўцы рабочай сілы, арганізацыі брыгад. Брыгада 3-яй групы швальнага цэху ў сваім падшэфным калгасе арганізавала брыгады, дапамагла падабраць старшых брыгадзіраў, замацавала зямлю і інвэнтар.

3 група машыннага цэху добра працуе ў калгасе „Першы май“, дзе з дапамогай шэфаў быў адрамантован інвэнтар, доктар мэдпункту фабрыкі правёў мэдагляд усіх кватэр і саміх калгасьнікаў, некаторым аказана мэдыцынская дапамога, арганізавана хатняя аптэчка.

Да пачатку сяўбы фабрыкай адрамантавана 20 хамутоў і 18 плугоў калгасу „Чырвоны спэцыяліст“ і інш.

Зараз пры фабрыцы арганізуецца магазын для здачы лішкаў сельска-гаспадарчых прадуктаў калгасамі і паасобнымі калгасьнікамі, замест якіх калгасьнікі будуць атрымліваць прамтавары.

Цэнтральнае месца ў нашай рабоце ў калгасах займае пытаньне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, ператварэньне калгаснай брыгады ў цэнтральнае зьвяно арганізацыі працы ў калгасе.

На рашаючым этапе конкурсу „Правды“, замацоўваючы посьпехі праведзенай работы, рабкоры яшчэ больш разгортваюць бальшавіцкую дапамогу ў сяўбе падшэфным калгасам, за пяршынства ў конкурсе „Правды“ на аснове рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4-га лютага і 6-ці ўмоў тав. Сталіна.

Асаёнак.

Вопыт сацспаборніцтва ф-кі—на поле саўгасу

Работніцы менскай швэйнай фабрыкі імя Крупскай у выкананьні пастаноў ЦК КП(б)Б аб дапамозе калгасам у часе 3-яй бальшавіцкай вясны з гонарам узяліся дапамагаць свайму падшэфнаму саўгасу „Чырвоны маяк“.

Пры фабрыцы з работніц складзена адказная тройка пад старшынствам работніцы-вылучэнкі тав. Гельфанд. Штодзенна пасылаецца брыгада з 25 работніц, якая і арганізацыйна і ў практычнай працы дапамагае ў працы саўгасу.

Работніцы фабрыкі імя Крупскай, працуючы ў брыгадах падшэфнага саўгасу, паказваюць бальшавіцкія тэмпы і перадаюць свой вопыт перавыкананьня прамфінпляну фабрыкі работніцам і рабочым саўгасу. Агітбрыгада ў часе абедзенага перапынку праводзіць гутаркі па растлумачэньню апошніх пастаноў ЦК і СНК аб збожжа і мясазагатоўках, калгасным гандлі і сельгаспадатку, па аграмінімуме і зоамінімуме, шырока ўкараняе іх у масы работніц і рабочых саўгасу. Наладзілі працу штодзенкі, якая сыстэматычна ілюструе змаганьне рабочых за бальшавіцкі ўраджай, за сканчэньне сяўбы ў тэрмін, на прыкладах лепшых мабілізуе масы, вядучы рашучую барацьбу з парушальнікамі працдысцыпліны, ілжэўдарнікамі і зрыўшчыкамі пасеўнага пляну.

Работніцы фабрыкі ўзялі на сябе абавязак дапамагчы падшэфнаму саўгасу выканаць пасеўны плян на 100 проц. і перавыканаць яго.

Першыя дні працы паказалі, што ўзятыя абавязацельствы будуць выкананы з такім гонарам, з якім выканан прамфінплян на фабрыцы. Лепшыя з лепшых калгасьніц ударніц, якія сапраўды правілі сябе на працы ў саўгасе, наступныя: Гельфанд, Кузьміна, Эльперына, Зэндэль, Дрэйцэр, Райзман, Цыпіна, Савіч, Дубэрштэйн, Хайман, Ліс, Кізіна, Левановіч і Шух.

Няхай наша ўдарная праца паслужыць прыкладам для іншых фабрык і заводаў.

Бялько.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя Леніна

Арганізацыя пастаянных вытворчых брыгад у калгасах, лепшае і сваячасовае выкананьне імі вытворчых заданьняў па сяўбе—забясьпечыць удзел у конкурсе, на лепшае правядзеньне сяўбы

Палажэньне аб конкурсе на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы раёнамі, сельсаветамі, МТС, саўгасамі, калгасамі і брыгадамі

Бурны рост індустрыялізацыі краіны, задача пасьпяховага выкананьня плянаў чацьвертага, заключнага году першай пяцігодкі і пераход да другой пяцігодкі патрабуюць ад сельска-гаспадарчай вытворчасьці напружаных тэмпаў работы, асабліва ў адзін з адказьнейшых пэрыядаў работы—у пэрыяд правядзеньня веснавой сяўбы.

Трэцяя бальшавіцкая сяўба праходзіць пад знакам барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за агратэхніку, за высокую якасьць работы, што павінна забясьпечыць павышэньне ўраджайнасьці саўгасна-калгасных палёў, павышэньне таварнасьці сельскай гаспадаркі.

Толькі пры ўмове актыўнага ўдзелу ў сяўбе кожнага саўгасу, МТС, калгасу, брыгады, брыгадзіра, рабочага, калгасьніка і спэцыяліста сельскай гаспадаркі могуць быць выкананы як колькасныя, так і якасныя паказальнікі плянаў веснавой сяўбы ў максымальна скарочаныя тэрміны.

У мэтах садзейнасьці шырокаму разгортваньню актыўнасьці рабочых саўгасаў, МТС, калгасьнікаў, калгасьніц і спэцыялістаў сельскай гаспадаркі ў справе барацьбы за бальшавіцкія тэмпы ў правядзеньні веснавой сяўбы—Народны Камісарыят Земляробства БССР абвяшчае ўсебеларускі конкурс на лепшае правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі 1932 году.

У конкурсе прымаюць удзел раёны, сельсаветы, МТС, саугасы, калгасы і брыгады.

Умовы конкурсу

1. Лепшая распрацоўка ў брыгадах і хутчэйшае давядзеньне да кожнага калгасьніка і рабочага саўгасу пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб збожжа і мясазагатоўках, разгортваньні калгаснага гандлю, новага закону аб сельскагаспадарчым падатку і практычнае іх ажыцьцяўленьне ў часе сяўбы.

Ударнікі т. т. Васіна і Дацэнка за сяўбой гароху. (Украіна).

2. Выкананьне плянаў сяўбы ў вызначаныя Наркамземам (гл. „Зьвязду“ ад 6 красавіка) тэрміны, палепшыўшы якасьць выпрацоўкі глебы, поўнасьцю ўжываючы агратэхнічныя мерапрыемствы.

3. Правільная арганізацыя пастаянных вытворчых брыгад у калгасах і лепшае выкананьне імі вытворчых заданьняў па сяўбе.

4. Поўны перавод рабочых саўгасаў на прынцып гаспадарчага разрахунку і ўвядзеньне зьдзельшчыны ва ўсіх калгасных брыгадах.

5. Поўная ліквідацыя абязьлічкі трактараў, жывой цягавай сілы і сельскагаспадарчага інвэнтару. Максымальна поўнае іх выкарыстаньне. Забясьпечанасьць коняй фуражом, ліквідацыя абязьлічкі ў доглядзе іх. Эканомія гаручага і змазачнага.

6. Арганізацыя перадачы вопыту работ лепшых брыгад, рабочых і калгасьнікаў у практыку ўсіх калгасаў і саўгасаў.

7. Арганізацыя вытворчых нарад у саўгасах, калгасах, брыгадах і актыўная іх работа.

8. Ахоп усіх рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і брыгад сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам.

9. Арганізацыя рэгулярнага выпуску насьценгазэт, шматтыражак і арганізацыя працы з рабкорамі.

10. Увядзеньне шматпольных севазваротаў, якія адпавядаюць спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі.

11. Стопроцантнае выкананьне плянаў пратручваньня, ачысткі і праверкі якасьці насеньня; абмен звычайнага насеньня на гатункovае; пасеў гатункovым і палепшаным насеньнем; поўнае выкарыстаньне саўгасамі і калгасамі радавых сяварак у часе веснавой сяўбы.

12. Выкананьне плянаў па вывазцы саўгасамі і калгасамі мінэральнага ўгнаеньня, поўнага і правільнага яго выкарыстаньня. Выкананьне плянаў вапнаваньня, тарфаваньня, збору і правільнага выкарыстаньня попелу. Сваячасовая вывазка і правільнае выкарыстаньне саўгасамі і калгасамі гною.

13. Выкананьне заданьняў па сяўбе, пашырэньне пасеўных плошчаў у саўгасах і калгасах за лік асваеньня новых зямель (раскарчоўка, узорваньне цаліны і г. д.).

14. Належная пастаноўка ўліку ў калгасах, забесьпячэньне калгасьнікаў працоўнымі кніжкамі, арганізацыя правільнага і сваячасовага запісу працадзён у працоўныя кніжкі не радзей аднаго разу ў пяціднеўку. Дакладны ўлік калгасьнікаў—ударнікаў, правядзеньне з імі зьлётаў.

Прэміяваньне

Для прэміяваньня лепшых раёнаў, сельсаветаў, МТС, саўгасаў, калгасаў, брыгад, брыгадзіраў, рабочых, калгасьнікаў, калгасьніц і спэцыялістаў сельскай гаспадаркі, якія лепш і раней за ўсіх правядуць веснавую сяўбу, выканаюць умовы конкурсу,—устанавіць наступныя прэміі:

1. Для лепшага ільнаводчага калгасу, які абслугоўваецца МТС—пераходны сьцяг газэты „Зьвязда“.

2. Адна прэмія для лепшага раёну—20.000 руб.
3. Тры прэміі для лепшых сельсаветаў па 2000 р.
4. Тры прэміі МТС па 3.000 руб.
5. Пяць прэмій саўгасам па 750 руб.
6. 15 прэмій калгасам па 1.000 руб.
7. Пяць прэмій лепшым брыгадзірам (пасылка на курорт) па 400 руб.
8. 10 прэмій лепшым брыгадзірам (скураной вопраткай) па 200 руб.
9. 50 прэмій брыгадзірам (рознымі рэчамі) па 100 руб.
10. 50 прэмій калгасьнікам-ударнікам грашыма па 100 руб.
11. 50 прэмій лепшым калгасьнікам - ударнікам (экскурсіі) па 100 руб.
12. 15 прэмій старшыням калгасаў па 200 руб.
13. 5 прэмій дырэктаром саўгасаў па 400 руб.
14. 50 прэмій лепшым рабочым саўгасаў і МТС (рознымі рэчамі) па 150 руб.
15. 5 прэмій старшыням сельсаветаў па 300 руб.



Догляд маладняка.

16. 5 прэмій насьценгазэтам па 150 руб.
17. 5 прэмій шматтыражкам па 100 руб.
18. 2 прэміі дырэктаром МТС па 400 руб.
19. 5 прэмій старшыням райкалгассаюзаў па 400 руб.
20. 5 прэмій загадчыкам райза па 500 руб.
21. 10 прэмій аграномам па 500 руб.
22. Адна прэмія станцыі па барацьбе са шкоднікамі расьлін—100 руб.
23. Дзьве прэміі праверачным пунктам па якасьці насеньня па 500 руб.
23. Дзьве прэміі лепшым камандам, пасланым у дапамогу па веснавой сяўбе ЦК ЛКСМБ і ВСФК—па 500 руб.
25. 5 прэмій раённым газэтам па 1.000 руб.

Установіць 100 ганаровых грамат саўгасам, МТС, сельсаветам і калгасам. Установіць 1500 ганаровых грамат рабочым-ударнікам саўгасаў, МТС, калгасьнікам і сельскагаспадарчым спэцыялістам.

Палепшыць культбытавое абслугоўваньне пасеўнай кампаніі

Пасьпяховае правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі ў значнай ступені залежыць ад таго, як будзе забясьпечан выхад калгасьніц на працу.

Ня гледзячы на тое, што тэрміны арганізацыі бытавых устаноў у калгасах прайшлі, у радзе райкалгассаюзаў да гэтага часу па-баявому не ўзяліся за гэту справу.

Так па зьвестках на 15-V ясельная кампанія разгорнута толькі па 40 раёнах. Перадавікамі ў гэтай справе зьяўляюцца Любаньскі, Полацкі, Нароўлянскі, Лёзьненскі і Талочынскі раёны, тут раённыя арганізацыі па-бальшавіцку ўзяліся за гэту справу. Такія раёны, як Койданава, Плешчаніцы, Мозыр, Рагачоў, Жлобін, Дрыса апартуністычна недаацанілі гэту надзвычайна важную кампанію і ганебна цягнуцца ў хвасьце.

Па зьвестках з 30 раёнаў, адчынена толькі 50 проц. патрэбнай колькасьці ясьляй. Некаторыя раёны зьменшылі вызначаныя ім пляны, як Рагачоў, Жлобін, Мазыр.

Яшчэ горш абстаіць справа з наладжваньнем грамадзкага харчаваньня. Адчыненьне сталовак па раёнах да гэтага часу ідзе надзвычайна марудна, асабліва гане на адстаюць у гэтым напрамку—Нароўля, дзе замест сталовак адчынілі ў калгасах 5 чайных, Чэрвенскі РКС да гэтага часу не адчыніў ніводнай сталоўкі. Апартуністычнае кіраўніцтва гэтых раёнаў лічыць для сябе выконваць дырэктывы партыі і ўраду не абавязковым.

Маюцца і добрыя прыклады арганізацыі бытавых устаноў, калгас імя Дзяржынскага Лагойскага раёну добра наладзіў грамадзкае харчаваньне. Сталоўка арганізавана на 300 чалавек. Маюцца сталыя ясьлі на 25 дзяцей. Дрэнна абстаіць з забесьпячэньнем і абсталяваньнем сталовых сыстэмы спажыўкаапэрацыі, якая да гэтага часу ня здолела падрыхтавацца да сяўбы.

Сарвалі курсы па падрыхтоўцы ясельных кадраў, Старобінскі, Касьцюковіцкі, Копыльскі раёны. Адстаючыя раёны павінны неадкладна пераключыцца на ўдарнае культ-бытавое абслугоўваньне вясновай пасеўнай кампаніі, гэтым самым забясьпечыць бальшавіцкае правядзеньне яе.

Грумбіна, Сідзіна.

Мацуем інтэрнацыянальную сувязь

Дэлегаткі, калгасьніцы і аднаасобніцы вёсак Скароднае, Шарына і мястэчку Ельск сабралі ў карысьць палітзьняволеных 400 руб. У вёсцы Шарын арганізавалі ячэйку МОПР'у. Дэлегаткі выклікаюць іншыя дэлегацкія сходы пасьледаваць іх прыкладу.

Брыгада: **Чаравецкая, Бровэр, Панухіна, Маргевіч і Фрайман.**



Кароўнік саўгасу № 2 імя ГПУ. Менскі раён.

Якасьць ураджаю залежыць ня толькі ад сваячасовай сяўбы, але і ад сваячасовай уборкі

Веснавая сяўба паказала, што ў радзе калгасаў і саўгасаў ня поўнасьцю скарыстоўваліся сельскагаспадарчыя машыны, у большасьці з прычыны нядбайных адносін да машын як з боку працуючых на іх, так і з боку праўленьняў калгасаў і адміністрацыі саўгасаў. У Чырвона-Слабодзкай МТС, з прычыны нядбайнасьці трактарыста Цэлябука Цімаха, трактар прастояў бяз працы два дні ў часе сяўбы. У Латыгальскім атрадзе МТС (Сеньненскі раён) наглядаліся вялікія і даволі частыя прастоі трактараў з прычыны нядбайных адносін да працы трактарыстаў і старшага рулявога Мяцеліцы. Старшыня камуны „Прагрэс" Бамбізаў (Лёзьнянскі раён) заявіў, што сявяркі ўжываць нявыгодна, бо няма лішніх людзей і коняй, ураджай аднолькавы, калі і рукамі пасеяць. І ў выніку такой палітыкі дзьве сявяркі ў камуне стаяць нескарыстанымі.



Першы савецкі электра-плуг арлоўскага за оду.

Падобныя прыклады ёсьць і ў іншых калгасах. Такія адносіны да машын зьяўляюцца вельмі шкоднымі і тым больш шкоднымі, што машын у нас не хапае і малая нагрузка існуючых машын яшчэ больш дае адчуваць гэты недахоп.

Гэты недахоп веснавой пасеўнай трэба ўлічыць пры правядзеньні ўборачнай кампаніі, аб якой ужо таксама пара падумаць. Бо мала забясьпечыць сяўбу, трэба і сваячасова ўбраць пасеянае.

Пасьпяховае правядзеньне ўборачнай кампаніі ў значнай ступені залежыць ад забесьпячэньня яе сельска-гаспадарчымі машынамі.

Ва ўборачную кампанію 1932 году будзе на палёх 16.130 камбайнаў. Адзін камбайн за тэрмін уборачнага сэзону можа ўбраць 400—500 *га* плошча.

Наяўнасьць машын яшчэ не забясьпечыць пасьпяховага правядзеньня ўборачнай. Патрэбна правільная арганізацыя працы ў самых саўгасах і калгасах на аснове правільнага пабудаваньня вытворчых брыгад. Памылкі веснавой пасеўнай у галіне скарыстаньня сельска-гаспадарчых машын павінны быць улічаны, і машыны патрэбна скарыстаць на ўсе 100 проц.

Радзіна В.

Перабудаваць шэф—работу фабрыкі „Чырвоны Тэкстыльшчык"

Перанясеньне вопыту ўдарнай працы прадпрыемства, вузораў барацьбы за прамфінплян на калгасныя палі—адзін з рашаючых момантаў у шэфскай рабоце. Нам непатрэбна шэфская работа наогул, як толькі сувязь, як толькі тое, што шэфы пабываюць у падшэфнікаў і наадварот. Патрэбна штодзенная дапамога ў працы па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў.

Фабрыка „Чырвоны тэкстыльшчык" (Менск) шэфствуе над Новасельскім сельсаветам, Пухавіцкага раёну. Сельвет мае 10 калгасаў. Была паслана брыгада з 5-ці асоб на дапамогу ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. „Выпускалі газэты, праводзілі сходы, і наогул вялі палітычную работу"—кажа старшыня фабкому тав. Завелевіч. А дзе-ж канкрэтныя вынікі гэтай работы. Ды цікава, якую-ж гэта палітычную, ня зьвязаную з практычнай работу, вяла брыгада.

Практычных вынікаў няма. Брыгада не правяла аніякай работы па арганізацыі вытворчых брыгад, па прымацаваньню да брыгад зямлі, жывёлы і інвэнтару, была выяўлена безгаспадарчасьць у некаторых калгасах, але на яе не рэагавалі. Гэта значыць, што брыгада працавала „наогул", што ніякіх практычных вынікаў працы брыгады няма і аб ёй ня ведае нават фабком. Для таго, каб канкрэтызаваць шэфработу, неабходна было паасобныя цэхі фабрыкі прымацаваць да калгасаў. Гэтага ня зроблена, а таму іняма апэрацыйнай работы. Не разгорнута соцспаборніцтва на лепшы цэх па шэфскай рабоце. Зусім не перадаецца і не пераносіцца вопыт працы ўдарнікаў фабрыкі на калгасныя палі.

Ніякіх агульных канфэрэнцый рабочых фабрык з прадстаўнікамі калгасаў па абгаварэньню важнейшых дырэктыў партыі па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў не праводзілася.

Фабрыка „Чырвоны тэкстыльшчык" належыць да шэф-кусту, які акрамя фабрыкі ўваходзяць Белгандаль, Белуціл і інш., якія яшчэ больш зрываюць шэфработу. Да 1-га мая прадстаўнікі Белгандлю павінны былі выехаць у падшэфны сельсавет для прэміяваньня лепшых ударнікаў. Але гэтыя прадстаўнікі Белгандлю, спасылаючыся на аб'ектыўныя прычыны — адсутнасьць прэмій, ня выехалі. На такі поўны правал шэфработы старшыня шэфства тав. Агнеўская не рэагавала.

Фабком і парткалектыў фабрыкі, як відаць з гэтага, не зьвярнулі належнае ўвагі на гэту галіну і пастановы партыі аб дапамозе калгасам у веснавой сяўбе ня выканалі. На якасьць работы выяжджаючых брыгад, на іх эфэктыўнасьць і вынікі працы, глядзяць абыякава.

У далейшым неабходна карэнным чынам перабудаваць шэфработу фабрыкі, каб яна сапраўды стала баявым зьвяном у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Камісарава.

Варварына перамога

Апавяданьне МАРЫЛІ ЯРШОВАЙ

Сямён захварэў і залёг у пасьцель, калі надышоў час араць. Надрываючыся ад кашлю, ён часамі пазіраў у веснавое неба, бясконца думаючы пра сваё няўдалае жыцьцё.

— Усё, што людзям на карысьць, для мяне, выходзіць, адна шкода, нават сонца, як кажа доктар, шкодзіць для лёгкіх, а чаму? Ды мусіць адна віна—беднасьць.

Вочы яго хмурнелі. Грудзі скрыпелі нібы драўляны ложак пад ім.

— Ізноў пачаў уздыхаць... Ачуняеш...—усьміхаючыся, суцяшала Сямёна жонка Варвара. Але ўсьмешка не вязалася з яе спалоханымі сумнымі вачыма. Варвара кахала мужа. Хвароба, наляцеўшы віхурай, зруйнавала і без таго іх бедную гаспадарку.

Але-ж яны не адны бедныя. Яна можа больш за дзесятак налічыць такіх-жа беднякоў, як і яны.

Сямён шанаваў Варваву. Праўда, твар яе пакрыты воспай, але-ж з тваву вады ня піць, за тое работа так і кіпела ў яе руках. Абое яны ішлі да аднэй мэты, як двое коняй у адных калёсах. Гэта мэта была разбагацець, набыць яшчэ аднаго каня з каровай, падладзіць хату. Часта пазіраючы на сьвіньню, абступленую сысункамі-парасятамі, Сямён, усьміхаючыся, гаварыў Варвары:

— Вось ты-б мне столькі нарадзіла, ды ўсё сыноў, вырасьлі-б—куды-б больш за сьвіней карысьці прынесьлі нам.

Але Варвара з жартаўлівым гневам гаварыла:

— Ах, бессаромнік ты, Сямёнка, маўчы, хібы-ж адразу дзесяць штук прывядзеш? Жывот па зямлі будзе валачыцца.—Яна сьмяялася, але ў глыбі яе вачэй таіўся сум. Ня дзесяць адразу, а і аднаго сына не нарадзіла Варвара Сямёну. У іх былі толькі дзьве дачкі—Аксіня і Маня—пяці і трох год, але гэтага ім здавалася вельмі мала, хацелася сына.

Забіць пагражаў Сямён за камуну тваю.

Ніколі яшчэ так цяжка Сямён не хварэў. Варвара спалохалася. Учора з вечара выехалі апошнія сяляне ў поле з сохамі і баронамі, а на дварэ Сямёна панура стаяў каля падрыхтаванага да выезду возу стары конік і запытальна, нібы чалавечымі вачыма, пазіраў на гаспадыню.

Варвара баялася прасіцца ехаць у поле. Калі яна пачынала гаварыць, што справіцца з ворывам адна, Сямён бялеў, тужыўся спаўзьці з ложка, адзецца і ехаць. На шчоках яго рабіліся гарачыя плямы, лоб пакрываўся потам, буйным, як гарох, і ён у зьнямозе кідаўся назад на ложак.

— Ведаю, як ты арэш?

Ён кідаў словы з прысьвістам, кашляў і задыхаўся. Быў выхад—гэты выхад толькі што арганізаваны калгас „Новы шлях". Але Варвара, адзін раз прапанаваўшы гэты выхад, які ёй здаваўся карысным, назаўсёды зараклася нават успамінаць пра калгас.

— Зруйнаваць хочаш, мужава дабро на вецер пусьціць... Пальцам не кранаў цябе, а яшчэ скажаш—заб'ю. Маё дабро... Ён паваліўся на падушку, каля хрыплівага роту забулькалі ружовыя пузыркі.

Калі праз некалькі дзён Варвара сустрэла дзядзьку Фрола, старшыню калгасу, які зноў заікнуўся аб іх уступленьні ў „Новы шлях", яна так замахала рукамі, што Фрол спахаўся.

— Што ты, можа беляны аб'елася?—запытаў Фрол.

— Забіць пагражаў Сямён за камуну тваю. Маўчы, дзядзька Фрол.

— Хто яго зьбівае? Ён-жа бядняк, як і мы, поплеч за савецкую ўладу змагаліся.

— Пятухоў ня раіць, — у раздум'і прагаварыла Варвара.

Дзядзька Фрол з прыкрасьцю паціскаў плячыма, задумаўся, потым скрыгануў зубамі і вылаяўся моцна і сакавіта. Варвара зьдзівілася ў сваю чаргу.

— Што ты?

— Вешалі-б гэту сволач, сэрца баліць ад гэтага чужаеда. За што я біўся, хіба за тое, каб бачыць, як гэты гад мне палкі ў колы ўстаўляе,—і моцная лаянка зноў зазьвінела ўвушшу. Калі Варвара адыходзіла, Фрол сказаў:

— Глядзі, Варвара, не варонь, у выпадку, калі Сямён памрэ, ты да нас за парадай. Ну, добра, зробіш так?

Але вочы Варвары пры мысьлі, што Сямён павінен памерці, наліліся сьлязьмі, грудзі сьціснуліся журбой і, нічога не адказаўшы, яна шпаркімі крокамі

пайшла да свае пакрыўленае маленькае хацінкі.

Сёньня Варвары было асабліва не па нутры. Яна расчыніла вакно і ў душны пакой уварвалася птушнае чырканьне і сьвежае веснавое паветра.

Нібы кволаму дзіцяці яна прыгладзіла валасы мужу і сумна зірнула на калёсы.

— Зьеў-бы бульбы, Сямёнка,— сказала Варвара.

— Бульбы ня трэба. Не хачу. Ён заўважыў яе захаваны погляд і нечакана для сябе сказаў:

— Памру я, Варвара, сыноў у цябе няма, шкада. Як-жа ты жыць будзеш? Хоць-бы дзесяцінак з пару зараць,—нібы вінаваты ў чым, ён пачаў распытываць жонку пра калгас. Варвара, бачачы ўважлівы твар мужа, разгаварылася.

— Пятнаццаць двароў увайшлі ў калгас. Кажуць, сельсавет адборнага насеньня дае. Лес для агульнай хаты адпускае. Дзяцей у школы паслалі.

— Грэх, мабыць, Варвара, цябе ў калгас выпраўляць.

— Які грэх, — запратэставала Варвара і дадала, — хочаш, я дзядзьку Фрола паклічу, пагутарыш.

Твар Сямёна пацямнеў.

— Не твайго розуму справа. Ён задумаўся. Баба—чалавек маленькі. Мне з жонкай раіцца ня рука,—як быццам сам сабе сказаў Сямён і, раптам нахмурыўшыся, дадаў:—ідзі, Варвара, за Пятуховым, скажы, перад сьмерцю прашу да сябе.

Пятухова прышлося прасіць доўга, але ўсё-ж ён прышоў. Важна пагладжваючы бараду, слухаў сумненьні Сямёна. З боку няпрыкметна паглядваў на Варвару. Параду даў такую:

— Ні ў якім выпадку ў камуну не запісвацца.

На ім, на Пятухову, вісіць крыжык і ў яго ёсьць сумленьне.

— Я-ж вось не калгас, усяго не адбяру і не пакрыўджу. З чатырох дзесяцін дзьве заару табе, а сабе за працу з ураджаю толькі 25 пудоў збожжа вазьму,— гаварыў Пятухоў спачувальна,— Каня на гэты час я вазьму ў цябе для падмогі ў рабоце.

— А рэшту — дзьве дзесяціны? — запытаў Сямён у замяшанасьці.

— Сабе заару. Усё роўна-ж у цябе яны незасеянымі застануцца.

— Слабенькі конік у нас.

— Ці слабенькі ці не, усё-ж у падмогу вазьму. Ня хочаш, шукай другога.

Сямён, уздыхнуўшы, згадзіўся.

— Варвара— баба здаровая. За лета доўг адпрацуе, калі збожжам не аддасьцё. Ураджай павінен быць добры, ня тое, што ў калгасьнікаў.

Варвара абурылася такімі адносінамі Пятухова, які не запытаў нават, ці хоча яна на яго рабіць.

Яна ўпарта, але ціха сказала:

— Не пайду наймічкай. У Пятуховых нават коні ад работы падаюць, пайду ў калгас...

Сямён задумаўся.

— А калі старая ўлада вернецца, што тады? — запытаўся Пятухоў і, чакаючы, паглядваў на Сямёна.

— Добра. Пойдзе Варвара да цябе рабіць, — сказаў Сямён. А Варвара нізка зьвесіла галаву. Пятухоў усьміхнуўся:

— Спалохалася, дурненькая? Каго-ж я пакрыўдзіў? Балдзіным пяць год заворваю—ня крыўдзяцца. Пішэце расьпіску, што вінны дваццаць пяць пудоў.

„А сын Балдзіна пяць год батраком у якасьці сваяка"—падумала Варвара, але змоўчала: яна ўжо адчувала Пятухова за гаспадара.

— Казявіным і Фролавым зараў, выбавіў ад голаду, толькі дзякуюць, Іваніны, сваякі, праўда...

— Эх, ды будзе табе, згодны-ж,—нечакана перапыніла Пятухова Варвара, — і, убачыўшы зьдзіўлены погляд мужа, спахапілася, выбегла з хаты.

— Што гэта яна? Можа з калгасьнікамі спазналася,—запытаў Пятухоў.

— Ды што ты... Хіба-ж я дазволю. Дзяды яшчэ дабро нажывалі, а я аддам?.. Заўтра, значыцца, заарэш?

— Заару. Маё слова сьвята.

Пятухоў устаў і хацеў ужо ісьці:

— Кароўку або коніка паставілі-б у заклад. На цябе, Сямён, надзея кепская, памрэш хутка, а Варвара — баба наравістая,— турботна прагаварыў Пятухоў.

— Коніка вазьмі. Карова для Мані з Аксіняй патрэбна, яны маленькія, без малака не абыдуцца.

— Стары конік, але ўсё роўна, карыстайся маёй дабратой.

Калі пачуўся тупат старога каня, якога выводзіў з двара Пятухоў, з вачэй Сямёна скупа пакацілася сьлязінка і згубілася нібы ў вывернутых барознах, у глыбокіх маршчынах.

* * *

Праз некалькі дзён пасьля гэтага Варвара прапанавала мужу пасядзець ля яго, але ён раззлаваўся.

— Ідзі, капай гарод. Я не ачуняю ад твайго сядзеньня і яйца не зьнясеш каля мяне. Зямлі ты патрэбней, чым мне, а я і адзін паляжу.

Каня ня было. Араць ня было каму. Рыдлёўкай рабіць было цяжка, бо на далонях у Варвары крывавіліся мазалі. Прыцягнуўшы саху, яна ўпрэглася ў яе замест каня. Пот сьцякаў з яе буйнымі кроплямі, ногі калаціліся, сэрца білася. Варвара захапілася работай, яна была ўпартая і настойлівая, але справіцца не змагла. Раптам звонкі рогат прымусіў яе спыніцца. З-за плеценіка выгля-



Панура стаяў стары конік і запытальна, нібы чалавечымі вачыма, пазіраў па гаспадыню.

дваў твар Пятухова. Ён працягваў Варвары кавалак кінутай мачалы і коўзаючыся ад сьмеху, крычаў:

— Хвост дзе-ж у цябе? На, прышый вось хвост, кабыла. Ну і ўмарыла-ж ты мяне.

Крыўда моцная ахапіла жанчыну. Твар яе наліўся крывёю.

— Чаго спахмурнела? Ды я такую работніцу азалачу. На гарнітур куплю і боты спраўлю, калі так і ў мяне будзеш рабіць. Варвара недаверліва ўсьміхнулася.

— Нічога ня выходзіць, — сказала яна.

Саха зноў задрыгала, але Пятухоў спыніў яе.

— Ідзі, муж твой памірае,— сур'ёзна сказаў ён. Варвара зьбялела, пачала нэрвова распрагацца.

— Чаго-ж ты раней не сказаў?—упікнула яна, бягучы з гароду да хаты. Пятухоў змоўк. Калі-б Варвара азірнулася, яна-б убачыла, як Пятухоў, пакручваючы ў руках рагожную вяроўку, пазіраў ёй сьледам і, прыкрыўшы рот рукою, калаціўся ад новага прыступу рогату.

Варвара, убегшы ў хату, трывожна зірнула на Сямёна. Сьмерць ужо пачала ўціскаць у сярэдзіну вочы мужа, завастрыла нос і абрывала рытм дыханьня. Жонка абняла Сямёна, нібы баронячы яго і пратэстуючы. Пах сьвежа раскапанай зямлі абдаў паміраючага. Сямён скалануўся. Яму здалося, сама вясна ўвайшла да яго ў душную хату і паклікала яго назад да жыцьця.

Ён убіраў у сябе Варварын востры пот, як пах сьвежай зямлі. Гэта выклікала прыліў страчанай сілы. Сямёну захацелася зірнуць на неба, падыхаць чыстым паветрам палёў і памерці. Ён папрасіўся на парог хаты. Бягом Варвара пабегла пад парог, кінула на ганак посьцілку з падушкамі і, вярнуўшыся па мужа, падняла яго ссохлае цела, беражліва апусьціўшы на падушкі. Хворы азірнуўся. Іх маленькі хлявец аблівала полымя захаду. Над іх страхой, нібы над вялікай мухаморай, яблыні разгойдвалі ружовыя палёсткі цьвету і разбухлыя пупышкі гаварылі пра новае жыцьцё. У хлявушку зарыкала карова асабліва прарэзьліва.

— Мамачка... А ў нас бычок, ідзі хутчэй,—выбегла з хлявушка



На, прышый восі хвост, кабыла.

Аксіня, радасна бліскаючы вочкамі. Варвара ня ведала, што рабіць. Сямён сеў, нібы спружына выпрастала яго.

—Ці-ж ня чуеш... Ідзі ж хутчэй,— строга сказаў ён жонцы і, калі яна пабегла да каровы, прагавіта выцягваючы шыю, сачыў за шорахам у хлявушку.

— Ну, каго бог паслаў?—запытаў ён Варвару, калі яна вышла з хлявушка.

— Хлопчыка, хлопчыка... бычка... — радасна шушукала яна, нібы зайздросьцячы. І раптам Сямёну жонка здалася такім-жа разбухлым пупышкам яблыні з бела-ружовымі пялёсткамі цьвету. Ён азірнуў сваё слабое паміраючае цела і жалосна зірнуў у Варварыны вочы.

— Слухай, Варварка, наказ мой апошні і сьвята захоўвай яго... Памру я, гаспадарку хавай як вачэй, не чапай дабра нашага, замуж ня ідзі, каму ты патрэбна з дзецьмі ды бедная. Нікому ня вер, глядзі, дзе і ад чаго карысьць. Бычка выгадуй на абмен. Ды яшчэ вось што... Зацяжарыш ад каго — дзіцяці ня выкідвай. Радзі.

І, бачачы, як спалохана пахіснулася жонка, прагаварыўшы: „Што ты, Сямён, ці-ж я згубленая якая", адказаў:

— Гнілы я быў, сына табе ня даў. Сын у гаспадарцы галава. Цяжарай ад здаровага... моцнага... і ня выкідвай... сьвіньня і тая носіць, адчувае, а я паміраю, Варка. Ты і адна вывезеш—ты моцная...—доўгая гаворка стаміла яго. Ён упаў на падушку. Пацалункі Варвары, яе голас, чуліся нібы з краю поля.

— Да зямлі мяне аднясі, Варвара...

Калі яна палажыла яго на зямлі, ён слаба павярнуў твар так, каб зямля дакранулася шчакі. Паміраючы, ён прыціскаўся да яе, нібы да матчыных грудзей, гатовай прыняць яго, так самаахвярна аддаўшага ёй усе сілы з дзіцячых гадоў. Глынаючы апошняе паветра, — васковыя пальцы нэрвова заскрэблі сухія камякі. У сьмяротнай трывозе пальцы спалохана разгіналіся і горбіліся, шукаючы абароны... Нібы спалоханае дзіця бяжыць да маткі з усіх ног і заміраючы, хапаецца за спадніцу любай, Сямён скрабануў апошні раз зямлю і замёр назаўсёды.

Варвара завыла. Гора, жудасьць перад будучынай і боязьнь перад невядомым атуманілі яе. Яна прышла ў сябе ад тоненькага плачу дзяцей. Некалькі чалавек суседак і бабуль угаварвалі яе адыйсьці і даць абмыць мёртвае цела. Уся апухлая ад сьлёз, яна з надзеяй зірнула на неба. Яно пабліскала веснавымі зоркамі сьвяточна і спакойна. Грандыёзная цішыня бясконцасьці блакітнымі рукамі кранула сэрца. Лёгкі ветрык надыходзіўшай ночы, нібы ласкавая рука, кранаў валасы. Яна перарывіста ўсхліпвала ў тупой роспачы, пазіраючы, як дзьве бабулі пачалі абмываць мужа.

— Ня плач, небарака... Мёртвае аддай зямлі... Грэх плакаць, зямля ўраджаю ня дасьць па старыннай прымеце.

— Зараз дзень год корміць, пра гаспадарку думаць трэба... У ней-жа багацьцяў не незапашана... — пачула Варвара стары голас.

(*Працяг будзе*).

Гутарка 10-я. Як змагацца са шкоднікамі ільнаводзтва

Шкоднікі ільнаводзтва прыносяць кожны год шкоду ільняным гаспадаркам. У некаторыя гады гіне каля 40 і больш проц. усходаў ільну, таму правядзеньне барацьбы са шкоднікамі адыгрывае вялікую ролю ў справе павышэньня ўраджайнасьці ільнаводзтва. Мы ў сваёй гутарцы разгледзім галоўных шкоднікаў ільнаводзтва, якія больш за ўсё пашыраны ў ільнаводчых гаспадарках БССР. Да гэтых шкоднікаў адносяцца ільняная блыха і ільняны чарвяк.

Ільняная блыха мае знадворны выгляд жучка, даўжыня якога ад 1,5 да 2 мілімэтраў. Калі прайсьці па полі ў часе зьяўленьня ўсходу ільну, то можна ў цёплы ясны дзень убачыць скачучых па ўсходах маленькіх жучкоў. Гэта і ёсьць ільняная блыха. У цёплыя дні блыха зьядае шмат усходаў і менш у вільготны хмуры дзень. Зімуе ільняная блыха пад апаўшымі лісьцямі на межах, дзе ёсьць шмат сухога зельля. Калі прыгрэе сонца, блыха выходзіць з-пад лісьцяў або сухога зельля і жывіцца ім да зьяўленьня ўсходаў ільну. Калі зьяўляюцца ўсходы ільну, то блыха нападае на іх і зьнішчае, прыносячы гэтым вялікую страту ільнаводным калгасам і саўгасам. Адначасова ў гэты час блыха ў вялікай колькасьці ложыць яйкі, з якіх выходзяць чарвякі. Яйкі блыха кладзе ў глебу кучкамі па 2—3 штукі каля карэньняў. Чарвячок ільняной блыхі жывіцца карэньнямі. Потым праз некалькі тыдняў ператвараецца ў лялечку, з якое выходзіць блыха.

Мера барацьбы. Першай мерай барацьбы з ільняной блыхой зьяўляецца ворыва поля пасьля ўборкі ільну. Пры ворыве ільняная блыха зьнішчаецца.

Патрэбна на межах зьнішчаць зельле якім жывіцца ільняная блыха да зьяўленьня ўсходаў ільну раньняй вясною. Трэба ўсе межы абавязкова заворваць.

Вялікую ролю адыгрывае раньні пасеў ільну. Пры раньнім пасеве ільну да зьяўленьня ільняной блыхі ўсходы пасьпеюць умацавацца і ня будуць так ба цца пашкоджаньняў ільняной блыхі.

Дзеці ў дзіцячым садзе за гарбатай

Калі вышэйадзначаныя мерапрыемствы не праведзены то патрэбна зрабіць апырскваньне ўсходаў ільну парыскай зеленью з вапнаю. Апрыскваньне робіцца раніцаю, або пад вечар. Парыскую зелень патрэбна зьмешваць са сьвежагашанаю вапнаю з разьліку на 1 частку зелені 8—10 частак сьвежагашанай вапны. Апырскваньне праводзіцца апыліцелямі, якія можна дастаць на машына-зьнішчальных станцыях па барацьбе са шкоднікамі сельскай гаспадаркі. Пры працы трэба памятаць, што парыская зелень зьяўляецца атрутаю, якая ў сваім складзе мае каля 55 проц. мышаку. Пасьля работы трэба добра мыць рукі з мылам.

Другім шкоднікам, які таксама прыносіць вялікую страту ільну, зьяўляецца ільняны чарвяк ці соўка-гама. Соўка-гама зьяўляецца матылём, вялікую страту прыносіць яе вусень. Зімуе соўка ў стадыі вусені, плодзіцца праз яйкі, якія адкладвае ў канцы мая пасьля спарваньня. Свае яйкі соўка-гама кладзе на пустазельле. Самка соўкі адкладвае ад 350 да 450 штук яек. Яйкі маюць цемнавата белы колер з зялёным адценьнем. Праз тыдзень або паўтары, у залежнасьці ад надвор'я, з яек выходзяць вусені, якія некалькі дзён жывуць на лісьцях, дзе былі пакладзены яйкі. Калі ўжо ня будзе хапаць харчоў на гэтых расьлінах, вусень пачынае перапаўзаць і нападаць на лісьці ільну, якія і зьнішчае. Апрача лісьцяў вусень зьядае кветкі, зялёныя плады і сьцябло. Ад пашкоджаньняў лён траціць валакна каля 50 і больш проц. Таксама зьмяншаецца і колькасьць насеньня.

Меры барацьбы з соўкаю—гэта зьнішчэньне пустазельля і апрыскаваньне ўсходаў ільну парыскай зеленью з мешанінай сьвежагашанай вапны,

Прымешваньне вапны спрыяе лепшаму прыліпаньню парыскай зелені да лісьцяў. Па ыская зелень з вадою добра разьмешваецца пакуль не атрымаецца цеста. Цеста паступова разьмешваюць з вадою. У другой пасудзіне гасіцца і разводзіцца вапна, якая прапускаецца праз сіта, каб у часе працы не забрудняўся і не забіваўся распыліцель. Разьведзеную зелень і вапну зьмешваюць, а потым дадаецца неабходная колькасьць вады. Ніколі ня трэба зелень сыпаць у адмераную ваду, бо яна будзе кавалкамі плаваць на паверхні. Атрыманую вадкасьць трэба ўліць у апрысквацель і зрабіць апрыскваньне расьлін.

Пры апрыскваньні хлорыстым барыем на 12 літраў вады трэба браць 400—600 грам барыя.

Кожны гурток павінен зрабіць практычныя заняткі. Навучыцца рабіць мешаніны атрутных матэрый. Схадзіць у поле і пашукаць на ўсходах ільну ільняных блох, а пазьней і чарвей соўкігамы.

Маркавец.

Рэдакцыя просіць кіраўнікоў і ўдзельнікаў гурткоў напісаць у часопісь аб ходзе заняткаў у гуртку і даць свае заўвагі наконт зьмяшчаемых гутарак.

Рэдакцыя

1763/XII

Парады агранома

ЗМАГАЙСЯ СА ШКОДНІКАМІ ГАРОДНІЦТВА

Шкоднікі гародніцтва прыносяць вялікую страту гародным культурам. Паводле статыстычных даных, кожны год ад шкоднікаў гіне да 40 проц. рознай гародніны. У мінулым годзе ў шмат мясцох ражавы пілільшчык зьнішчыў на 100 проц. гародныя плошчы, капусны беляк да 75 проц.

Гэта тлумачыцца тым, што калгасы і саўгасы ў большасьці мала зварочваюць увагі на ахову гародных расьлін ад шкоднікаў і пры іх масавым зьяўленьні ня ведаюць мер барацьбы з імі.

Зараз мы разгледзім галоўных шкоднікаў гародніцтва, якія наносяць больш усяго страт. Да такіх шкоднікаў адносяцца: беляк капусьнік, капустажэр звычайны, капусная муха, ражавы пілільшчык.

Беляк капусьнік вельмі пашыраны шкоднік гародніцтва па Беларусі. Ня раз калгасы і саўгасы заставаліся без капусты таму, што ён яе поўнасьцю зьнішчаў. Дарослы беляк капусьнік—ёсьць матыль, які мае белыя крыльлі. Вяршкі пярэдніх крыльляў афарбаваны ў чорны колер. Зьяўляецца матыль у канцы мая месяца. Пасьля спарваньня самка беляка пачынае адкладваць яечкі (да 150 шт). на кожны бок ліста капусты ці на пустазельле. Яечкі самка матыля кладзе кучкамі. Праз тыдні паўтары з яечак выходзяць вусьні. У першы час свайго жыцьць вусені жывяцца тымі лісьцямі, дзе яны вывеліся. Дарослы вусень нападае на качан капусты і ўядаецца ў яго нутро. Ад пашкоджаньняў качан у большасьці загнівае. У часе ўборкі капусты вусень вывальваецца з качана і ў глебе ператвараецца ў лялячку. Вясною з лялячкі вылятае матыль.

Меры барацьбы з капустажэрам цяжкія, асабліва з вусенем, які ўвесь час жыве ўнутры качана. Можна змагацца з лялькаю вусьня. Для гэтага трэба вясною зрабіць ворыва гароду, якое зьнішчае лялечкі капустажэра.

У часе зьяўленьня вусьняў трэба зрабіць апырскваньне капусты атрутнымі матэрыямі.

Ражавы пілільшчык у мінулым годзе прынёс вялікую страту гародніцтву, зьнішчыўшы ў шмат якіх калгасах і саўгасах на 75—100 проц. капусту, турнэпс, гарчыцу, бручку і інш. расьліны. Самка ражавага пілільшчыка вясною ў канцы мая кладае яечкі на сурэпіцы і дзікую рэдзьку. З яек выходзіць вусень, які ў першы час жывіцца пустазельлем, а потым пераходзіць на гародныя расьліны і зьнішчае іх. Жывіцца ён мякацьцю ліста, ад чаго на апошнім зьяўляюцца маленькія дзірачкі. Калі ўжо стравы не хапае, дык вусьні распаўзаюцца і пачынаюць зьнішчаць капусту. Дарослы вусень вельмі пражорліў і зьнішчае шмат расьлін. Ад лісьцяў капусты застаюцца толькі адны жылкі. У канцы чэрвеня ці ў пачатку ліпеня, калі вусень дасягае поўнага ўзросту, ён ператвараецца ў ляльку. У канцы ліпеня або пачатку жніўня з лялечкі вылятае матыль, які кладзе зноў свае яечкі. Вусень з яечак другога пакаленьня таксама прыносіць вялікую шкоду гародным расьлінам, асабліва капусьце. Увосень вусень другога вываду ляльkаецца і так зіму да вясны.

Меры барацьбы. Самай галоўнай мерай барацьбы зьяўляецца зьнішчэньне пустазельля. Пры зьнішчэньні пустазельля на гародах капусьніку ня будзе дзе класьці сваіх яечак.

Добраю мерай барацьбы з капусьнікам зьяўляецца раздушваньне яечак, адкладзеных самкаю матыля. Для гэтага трэба мабілізаваць школьнікаў, піянэраў.

Пры зьяўленьні вусеня можна рабіць апырскваньне гародных расьлін рознымі атрутамі, як парыскай зеленьню са сьвежа-гашанай вапнай. Таксама апырскваньне капусты супроць вусеня беляка можна рабіць джыжынам, на 12 літраў вады трэба браць 27-30 грам джыджыну. Джыджын—парашок белага колеру, які зусім не расчыняецца ў вадзе. Уласьцівасьці яго добрыя тым, што пры апырскваньні ён ня паліць расьлін.

Акрамя джыджыну можна браць хлёрысты бары.

Капустажэр звычайны зьяўляецца другім шкоднікам, які наносіць вялікую страту гародніцтву БССР. Капустажэр—матыль, які мае цёмна-бурыя пярэднія крыльлі з цёмнымі папярэчнымі палоскамі. На гарадох матыль зьяўляецца ў канцы чэрвеня месяца. Лётае матыль выключна ноччу.

Праводзіць барацьбу з гароднымі шкоднікамі трэба сваячасова. Зараз кожны калгас, саўгас павінны арганізаваць атрады, прыцягнуўшы для гэтага ячэйку Асоавіяхіму. Толькі пры сваячасовай падрыхтоўцы да барацьбы са шкоднікамі гародніцтва мы зможам сваячасова зьнішчыць іх. Пры зьяўленьні шкоднікаў гародніцтва зараз-жа трэба зьвярнуцца ў міжраённую станцыю па барацьбе са шкоднікамі сельскай гаспадаркі, або ў райза ці Райкалгассаюз.

Аграном Маркавец.

Рабкоркі—пішэце ў часопісь як на вашым прадпрыемстве праходзіць Сталінскі паход за паляпшэньне рабочага забясьпячэньня, як рэалізуецца пастанова партыі аб трусагадоўлі.

Селькоркі—пішэце як ваш калгас уключыўся ў конкурс на лепшае правядзеньне севу, як рэалізуюцца апошнія пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК аб збожжа і мясазагатоўках, калгасным гандлі і сельгаспадатку.

Рэдакцыя часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі“ чакае ад вас матар'ялаў.

РЭДАКЦЫЯ

847

ЗЬНІШЧЫЦЬ ШКОДНІКАЎ САДОЎНІЦТВА

Шкоднікі саду, як пладажэрка, яблыневы кветкажэр, кальчаты шаўкапрад і шмат іншых шкоднікаў прыносяць саду страты больш як на адну трэць усёй прадукцыі. Ва многіх раёнах барацьба са шкоднікамі садоўніцтва пастаўлена зусім дрэнна, праз гэта ў іншыя гады шкоднікі саду зьнішчаюць поўнасьцю ўвесь ураджай садавіны. У нас ёсьць многа садоў пры жактах, школах, дзіцячых дамох і іншых установах, але догляду іх у большасьці зусім няма. Нават нэкаторыя калгасы і саўгасы недаацэньваюць важнасьць правядзеньня барацьбы са шкоднікамі саду. У пяцігадовым пляне многа ўвагі аддана разьвіцьцю садоўніцтва, а разам з гэтым і правядзеньню барацьбы са шкоднікамі саду, як адным са сродкаў павышэньня ўраджайнасьці садоў. Наша задача ў сучасны момант заключаецца ў тым, каб фрукты сталі даступны кожнаму працоўнаму і каб на кожнага працоўнага прыходзілася ня менш 25 *кгр.* садавіны ў год. Але складаную задачу, якая пастаўлена савецкай уладай і партыяй у галіне вырашэньня праблемы садавіны, можна і патрэбна выканаць праз правільную пастаноўку працы ў буйных садова-гародных гаспадарках, у якіх павінны праводзіцца ўсе навейшыя агракультурныя мерапрыемствы.

Каб шкоднікі саду ня прыносілі вялікай шкоды, патрэбна правільна арганізаваць барацьбу з імі. Зьнішчэньне шкоднікаў трэба праводзіць ва ўсіх калгасных, саўгасных, а таксама і індывідуальных садох, што ляжаць блізка адзін да аднаго, у адзін тэрмін, бо інакш шкоднікі з таго саду, дзе не праводзілася барацьба з імі, пяройдуць і ў суседнія сады.

Да шкоднікаў садавіны адносяцца баярышніца і кальчаты шаўкапрад. Баярышніца зьяўляецца вельмі пашыраным шкоднікам садоў Беларусі. Яна наносіць вялікую страту, зьнішчаючы ў іншыя гады ледзь ня ўвесь ліст на дрэвах саду. Калі хто прыглядаўся ўвосень пасьля ападу лісьцяў, ці зімою да пладовых дрэў, то на галінках мог заўважыць сухія скручаныя лісьці, якія ад паветра калышуцца на павуціньнях. У сярэдзіне гэтых скручаных лісьцяў знаходзяцца маленькія вусені. Гэта і ёсьць вусень баярышніцы. Вясною, як толькі пачне прыграваць сонца, з лісьцяў пачнуць вылазіць вусені і нападаць на маладзенькія лісткі дрэў. Спачатку шкода ад вусеняў невялікая—гэта тлумачыцца тым, што вусені маленькія зьядаюць нязначную колькасьць лісьцяў, але потым з ростам вусені павялічваецца і страта ад іх. Апрача лісьцяў вусень паядае і плядовыя пупышкі. Па знадворным выглядзе баярышніца зьяўляецца матылём белага колеру з чорнымі жылкамі на крыльлях. У канцы лета самка баярышніцы кладзе на лісьцях яблынь і груш кучкамі па 10—20 яек. Яны ў першы час маюць жаўтаваты колер. Самка адкладвае ў сярэднім ад 100 да 250 штук яек. Праз некаторы час з яечка выходзіць вусень, які ў першы час свайго выхаду жывіцца мякацьцю ліста. На зіму вусень гэтыя жылкі ліста і скуру абвалаквае вакол сябе павуціньнем, робячы такім чынам гняздо.

Меры барацьбы. У часе зьяўленьня вусені на дрэвах вясною ці ў пачатку лета трэба апошнія папырскаць растворам парыскай зелені з вапнаю. На 12 літраў вады трэба браць 12—15 грам парыскай зелені і 12—15 грам парыскай зелені і 24—30 грам сьвежагашанай вапны.

Кальчаты шаўкапрад. Калі ўзімку выйсьці ў сад і прыгледзецца да галінак пладовых дрэў, то можна заўважыць вакол іх цёмныя абручыкі, якія як-бы зроблены з галінак—гэта ёсьць ні што іншае, як яечкі кальчатага шаўкапрада. Па знадворным выглядзе кальчаты шаўкапрад падобен на матыля з калматаю паверхняю. Саміца кальчатага шаўкапрада пасьля спарваньня адкладвае на тоненькіх галінках яблынь і груш яечкі ў выглядзе абручыка. Адкладзеныя яечкі так і застаюцца бяз усякай накрышкі зімаваць. Вясною, як толькі прыгрэе сонца, з яечак выходзіць вусень, які робіць лісьцям вялікую шкоду. Дарослы вусень вельмі пражорлівы. Мае шэра блакітную афарбоўку з белаю палоскаю на сьпіне. У чэрвені ці ліпені вусень ператвараецца ў кукалку, з якое праз некаторы час вылятае матыль.

У часе зьяўленьня вусеняў кальчатага шаўкапрада трэба зрабіць апырскваньне дрэў растворам парыскай зелені з вапнаю.

Кожная калгасьніца, саўгасьніца павінна змагацца за сваячасовую барацьбу са шкоднікамі саду.

А.

Выданьне ЦК КП(б)Б.

Час. вык. абав. рэдактара В. БУЛКО.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 1207. 17.200 экз. Уп. Галоўлітбелу А-2.

206618